ПАДЗЕЯ




# РОДНАЕ СЛОВА БУДЗЕ ГУЧАЦЬ

**Дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняла ўдзел у мерапрыемствах XXXII Дня беларускага пісьменства (г. Ліда, 6-7 верасня 2025 года).**

Так сталася, што літаратурная восень на Гродзеншчыне сёлета пачалася з грандыёзнага свята. У Лідзе сваё мастацтва прэзентавалі: лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён); паэтэса Наталля Цвірко (Шчучынскі раён); лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён); паэт, краязнавец Уладзімір Руль (Воранаўскі раён); публіцыст, краязнаўца Галіна Антонава (Смаргонь); паэт, публіцыст Руслан Піваварaў (Ліда); празаік Максім Бацкалевіч (Ліда); паэт, публіцыст, краязнавец Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён), а таксама члены СПБ з Гродна: пераможца III Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) і Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча, паэт, публіцыст, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур; паэт Анатоль Апанасевіч; пераможца IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), паэтэса Кацярына Каламійцава; пераможца IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць; літаратуразнаўца, літаратурны крытык, паэтэса Святлана Тарасава; публіцыст Уладзімір Ягорычаў; пераможца IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), дзіцячая пісьменніца Таццяна Сучкова; лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, пераможца III Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая; лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко і XXIII Міжнароднага Пушкінскага конкурсу, празаік Ліна Багданава (Г. А. Богдан); паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык і канешне, старшыня ГрАА СПБ, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса, празаік, перакладчык Людміла Кебіч. У творчай праграме, якая была прысвечана 20-годдзю Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ і называлася «20 гадоў на службе Слову», таксама выступілі маладыя, перспектыўныя аўтары, пераможцы шматлікіх літаратурных конкурсаў, кандыдаты на ўступленне ў шэрагі СПБ: паэтэса Вольга Алізар; паэт, празаік, драматург Андрэй Дарожкін і паэтэса, публіцыст Юлія Мельнік.




Кожны з літаратараў вобласці падарыў гасцям свята часцінку сваёй душы. У аўтарскім прачытанні прагучалі творы паэзіі, прозы і публіцыстыкі на беларускай і рускай мовах, адбыліся прэзентацыі новых кніг, сустрэчы з чытачамі і калегамі з іншых абласцей. У выступленнях прынёманскіх аўтараў атрымала ўвасабленне патрыятычная, духоўная, філасофская тэматыка. Адметнасцю творчай праграмы літаратурнай Гродзеншчыны стала яе выразнае грамадзянскае гучанне. Ідэйна-тэматычны змест прадэманстраваных выданняў і прачытаных твораў склалі 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, матывы народнага адзінства, гістарычнай памяці і любові да Радзімы.

Акрамя ўласнай прэзентацыйнай праграмы на Фестывалі кнігі і прэсы, наша дэлегацыя весела пагасціла ў павільёне суседзяў-берасцейцаў, арганізавала і правяла рэспубліканскі марафон ваенна-патрыятычнай лірыкі «Радкі бессмяротнасці» («Строки бессмертия»), натхнёны подзвігам лётчыкаў Лідскай ваеннай авіябазы, Герояў Беларусі Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Куканенкі; наведала гала-канцэрт урачыстага адкрыцця свята; пабывала на экскурсіі ў Лідскім замку; прыняла ўдзел у канцэрце Саюза пісьменнікаў Беларусі, ва ўзнагароджанні пераможцаў арганізаванага Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Рэспубліканскага конкурсу на лепшы паэтычны зборнік імя паэта-барацьбіта Валянціна Таўлая «Шляхі, пракладзеныя ў заўтра». Госці-пісьменнікі далі вялікую колькасць інтэрв'ю для СМІ.

Дзякуючы нашым сябрам, лідскім паэтам Руслану і Святлане Піваваравым, мы бываем у Лідзе вельмі часта. Тут, у літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» ужо паказалі сваю творчасць нямала гродзенскіх аўтараў. Таму многія з нас у Лідзе адчувалі сябе сваімі. Разам з намі ў літаратурным павільёне Гродзенскай вобласці выступілі пісьменніцкія калектывы Лідскага раённага літаратурнага аб'яднання «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін), Лідскай міжнароднай суполкі «Чертог Поэта» (кіраўнік член СПБ, паэт Руслан Піваварaў), а таксама (якое ж свята без гасцей!) Гарадскога літаб'яднання горада Баранавічы «Купальскія зоры» (кіраўнік член СПБ, паэтэса Таццяна Яцук). Кожны з удзельнікаў свята атрымаў порцыю такой важнай і патрэбнай увагі, сваю «хвіліну славы».

Нельга не падзяліцца гонарам за наш Прынёманскі край, нельга не ганарыцца яго гасціннасцю, традыцыйна высокай культурай, самаадданасцю і прафесіяналізмам простага чалавека працы. Таксама выклікае павагу эфектыўная дзейнасць абласной і раённай галін улады. Як вынік – найвышэйшы за апошнія гады ўзровень арганізацыі Дня беларускага пісьменства. І яшчэ. У Лідзе члены «прынёманскай каманды» праявілі сябе адзінай, дружнай сям'ёй аднадумцаў, людзей родных не па крыві, а па духу. Гэты факт можна назваць самым каштоўным набыткам, агульным дасягненнем вельмі розных творчых людзей, традыцыяй, якая доўжыцца не адно дзесяцігоддзе і, безумоўна, вартая годнага працягу. Мы добра разумеем, што выніковая

інфармацыя з усіх куткоў Беларусі пра наведванне святочнай Ліды не будзе прынцыпова адрозніваецца ад нашай. Таму, што менавіта ў гэтым – спагадзе, узаемнай падтрымцы, душэўнай цеплыні – бачыцца практычная рэалізацыя фундаментальнай для нас ідэі саюзнасці. У гэтым – усе мы, беларусы. У нас застануцца творчыя перспектывы толькі праз жывы ў слове народны дух, праз яго святасць, праз веру і надзею. Мы ўпэўненыя: калі атрымаецца захаваць найлепшыя традыцыі, – захаваюцца і ўвага з боку чытацкай аўдыторыі, і запатрабаванасць нашых твораў. І роднае слова будзе гучаць. Дзякуй за ўсё, прыгажуня Ліда! Наступны прыпынак – Касцюковічы.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

***На фота:*** прынёманскія творцы на галоўным свяце айчынных літаратараў – Дні беларускага пісьменства. Эпізоды. Гродзенская вобласць, горад Ліда, 6-7 верасня 2025 года.




**Адкрыла наш літаратурны парад старшыня ГрАА СПБ Людміла Антонаўна Кебіч**



**Вуліца Мітрапаліта Філарэта ў дні свята выглядала «літаратурным бульварам». З правага боку на заднім плане – павільёны ўсіх абласцей і горада Мінска.**




**Песню на словы Таццяны Яцук выконвае Галіна Бабонава (Баранавічы)**



**Вольга Алізар (Гродна)**



Анатоль Апанасевіч (Гродна)




Галіна Антонава (Смаргонь)





Празаік Максім Бацкалевіч (Ліда) – таленавіты і мужны сын мужных бацькоў




**Выступленне Максіма Бацкалевіча нікога не пакінула раўнадушным**




**Адбылося ўзнагароджанне пераможцаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Папяровы бусел» (Брэст)**




**Удзельнікі песенна-паэтычнага конкурсу ў павільёне Брэсцкай вобласці**




**Кацярына Каламійцава (Гродна)**




**Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён)**




**Ганна Скаржынская-Савіцкая (Гродна)**




**Таццяна Сучкова (Гродна)**




**Таццяна Яцук (Навагрудскі раён)**




**Святлана Тарасава (Гродна)**



Наталля Цвірко (Шчучынскі раён)




Публіцыст Уладзімір Ягорычаў (Гродна)



Андрэй Дарожкін (Гродна)



Уладзімір Руль (Воранаўскі раён)



Ліна Багданава (Г. А. Богдан), г. Гродна




Андрэй Татур (Гродна)




Юлія Мельнік (Гродна)




Руслан Півавараў (Ліда)




Святлана Піваварава (Ліда)




Аліна Сабуць (Гродна)



Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён)




Дзмітрый Радзівончык (Гродна)



«Строки бессмертия». Поэт Сергей Ситкевич (Орша)



Ксения Ермилова (Минск)



Тереза Смольская (Лида)




Ольга Олизар (Гродно)



**Алла Юшко (Лида)**



**Светлана Пивоварова (Лида)**



**Татьяна Семёнова (Лида)**



**Татьяна Яцук (Барановичи)**





**«Строки бессмертия». Владимир Руль (Вороновский р-н)**

**Екатерина Коломийцева (Гродно)**





Анна Реликовская (Лида)



Тамара Краснова-Гусаченко (Витебск)



Инна Соломаха (Витебск)



Лина Богданова (Гродно)



Юлия Мельник (Гродно)



Руслан Пивоваров (Лида)



Александр Морозов (Островецкий р-н)



Андрей Татур (Гродно)





Николай Ивановский (Волковысский р-н)

Ирина Маркевич (Лидский р-н)






**Калектыў Гарадскога літаб'яднання горада Баранавічы «Купальскія зоры» (кіраўнік член СПБ, паэтэса Таццяна Яцук)**



**Поэтесса Елена Нестерова (Лида)**



**Василий Горгуль (Лида)**




**Сустрэчы з сябрамі і калегамі на Свяце пісьменства – звычайная справа**










**Да Дня беларускага пісьменства ў Лідзе наш калега па СПБ, лідскі паэт Руслан Півавараў уласнымі рукамі ўпрыгожыў інтэр'ер Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы партрэтнай галерэяй пісьменнікаў**


Няма такіх кніг,
у якіх нельга было б
чаму-небудзь навучыцца.
Сымон Будны
"Любіце кнігу,
бо яна – крыніца мудрасці,
ведаў і навукі, лекі для душы
Францыск Скарын


Автор идеи, дизайнер
картинной галереи
Лидской районной
библиотеки имени Янки
Купалы–
Руслан Пивоваров
РУСЛАН АНАТОЛЬЕВИЧ ПИВОВАРОВ –
ПОЭТ, ПРОЗАИК, ПУБЛИЦИСТ,
ОБЩЕСТВЕННЫЙ ДЕЯТЕЛЬ, АВТОР СТИХОВ, ПОЭМ, РАССКАЗОВ
И СКАЗОК. ЧЛЕН СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ.
НЕОДНОКРАТНЫЙ ЛАУРЕАТ МНОГИХ ПРЕСТИЖНЫХ
МЕЖДУНАРОДНЫХ ЛИТЕРАТУРНЫХ ПРЕМИЙ И КОНКУРСОВ
РОССИИ, БЕЛАРУСИ, КАЗАХСТАНА.


**Дзмітрый Радзівончык з таленавітым беларускім паэтам з Магілёва Алесем Казекам**



**Ліна Багданава з выдаўцамі яе твораў у павільёне выдавецтва «Мастацкая літаратура»**



**Андрэй Татур сустрэўся з землякамі, аматарамі літаратуры з Дзятлаўскага раёна**




**На Свяце пісьменства можна абмяняцца аўтарскімі кнігамі, што і зрабілі Юлія Мельнік і Мікалай Іваноўскі**



**Юлія Мельнік з народным артыстам СССР, членам СПБ Эдуардам Ханком**






**Народный артист СССР Эдуард Ханок и Народный писатель Беларуси Николай Чергинец**



Екатерина Коломийцева и Светлана Пивоварова






**Алесь Хітрун і Аліна Сабуць**




**Андрей Дорожкин и Юлия Мельник**





Літаратары з Гродна і Ліды: Дзмітрый Радзівончык, Анатоль Апанасевіч, Святлана і Руслан Піваваравы


ДЗЕНЬ
БЕЛАРУСКАГА


ДЗЕНЬ
БЕЛАРУСКАГА


ДЗЕНЬ
БЕЛАРУСКАГА




ДЗЕНЬ





Прадстаўнік літаратурнай Гродзеншчыны, паэт і спявак Андрэй Татур выступае на канцэрце СПБ







**Такое ўражанне, што ў госці да пісьменніцкага свята завіталі іншыя фестывалі…**










ЛІДСКІ
ФІЛІЯЛ
ЗАПРАШАЕ!





**На экскурсіі па Лідскім замку**



**Ганна Скаржынская-Савіцкая. Крок у Сярэднявечча**





**Аліна Сабуць. Былых лідчанак не бывае...**



Рэспубліканскі конкурс на лепшы зборнік сучаснай паэзіі Беларусі імя паэта-барацьбіта Валянціна Таўлая «Шляхі, пракладзеныя ў заўтра». Узнагароджанне пераможцаў з удзелам першага намесніка старшыні СПБ Алены Стэльмах








Дыплом


Дыплом











**Уладальніца спецыяльнага дыплома СПБ, паэтэса Вольга Алізар падарыла Дому-музею Валянціна Таўлая сваю кнігу і вышываны рушнік**







**Каля адкрытага да Дня пісьменства арт-аб'екта «Верабейка» з найбуйнейшым у Беларусі спецыялістам па В. П. Таўлаю Алесем Хітруном**



**Бывай, прыгажуня Ліда. Да хуткай сустрэчы!**



Увайшлі ў гісторыю разам…

